# Маладзечна - 2015

XV Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі прайшоў у Маладзечне з 5 па 7 чэрвеня.

Паводле міністра культуры Барыса Святлова, па сваёй значнасці гэты фестываль можна параўнаць са "Славянскім базарам у Віцебску", аднак музычны форум у Маладзечне накіраваны менавіта ў бок нацыянальнай культуры.

Самым цікавым міністр лічыць конкурс маладых талентаў, бо гэта музычная, культурная будучыня краіны.

А перамогу ў конкурсе маладых выканаўцаў і Гран-пры атрымала 23-гадовая Таццяна Валахановіч з Менскай вобласці.

XV НАЦЫЯНАЛЬНЫ ФЕСТЫВАЛЬ БЕЛАРУСКАЙ ПЕСНІ І ПАЭЗІІ

МАЛАДЗЕЧНА-2015

Таццяна Валахановіч закончыла Менскі дзяржаўны каледж мастацтваў, паступіла ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (завочное аддзяленне). Цяпер працуе ў Дзяржынскім раёне кіраўніком эстраднай студыі "Галасы". Дарэчы, дагэтуль дзяўчына перамагала толькі на раённых конкурсах.



Акрамя лідара журы вызначыла пяцёрку найлепшых з двух дзясяткаў намінантаў. Званне лаўрэата і ўладальніка першай прэміі дасталася Мікіту Касцюкевічу з Менска. Другое месца ў пары канкурсантаў з Берасцейскай вобласці - Андрэя Цямчыка і Лізаветы Войтуль. Трэцяе месца падзялілі Яўген Захарка з Гарадзеншчыны і мянчук Дзмітры Нікіцін.

Адметнасцю фестывалю быў небывала нізкі ўзровень валодання беларускай мовай. Трасянка вядоўцаў, няздольнасць маладых выканаўцаў звязаць тры словы па-беларуску. Відаць, аднымі песнямі мову не ўратуеш.

***Наш кар.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ